Источник: "Наша слова" - 2012-10-17

110 гадоў з дня нараджэння Кастуся Кернажыцкага

Кернажыцкі Канстанцін Іванавіч (8.10.1902-28.02.1942). Ураджэнец в. Выдранка Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Краснапольскі р-н Магілёўскай вобл. Вучоны- гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1934), дацэнт. Нарадзіўся ў сям'і святара. У пачатку 1920-х г. паступіў у БДУ. Ажаніўся, гадаваў дваіх дзяцей. Скончыў БДУ у 1926. Працаваў настаўнікам (1919-1921), у БДУ, Вышэйшым педагагічным інстытуце, навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, памочнікам рэдактара аддзела гісторыі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Даследаваў гісторыю сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі эпохі феадалізму і капіталізму і быў аўтарам каля 20 навуковых прац. Выйшла манаграфія "Аграрная рэформа ў Бабруйскім старостве і эканамічнае становішча з 17 да паловы 19 ст." (1931), "Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной" (1932), "Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы 17 і першай палове 19 ст." (1935), "Старонкі з гісторыі рабочага руху перыяду імперыялістычнай вайны" і іншыя. Ён быў адным са складальнікаў зборніка дакументаў "Гісторыя Беларусі у дакументах і матэрыялах" (Т.1, 1936).

Арыштаваны ў Менску 11.12.1937. Асуджаны "тройкай" НКУС 14.5.1939 як



"польскі шпіён" да 8 гадоў ППК. Асабістая справа К. № 11843-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Памёр у лагерным шпіталі. Рэабілітаваны 5.6.1958 г.

(Паводле Вікіпедыі.)